**Кемен А.А.,**
суіскальнік кафедры
сацыялогіі і культуразнаўства

# УЗАЕМАСУВЯЗЬ МІФАЛОГІІ І РЭЛІГІІ

Пытанне суадносін рэлігіі і міфалогіі на розных этапах вырашалася па-рознаму. Неабходна ўказваць на падабенства і адрозненне паміж міфам і рэлігіяй. Міф не рэлігія, не крыніца рэлігіі: гэта першабытная філасофія, часткова нават мастацкі вымысел. Рэлігія можа толькі выбіраць міфы, адкідаючы несумяшчальнае з ёй.

Сама па сабе міфатворчая дзейнасць чалавечага розуму не змяшчае нічога рэлігійнага. Але калі міфы тлумачаць з'явы сацыяльнага жыцця, звычаі, гэтае тлумачэнне ператвараецца ў міфалагічнае абгрунтаванне ўказаных формаў сацыяльнай практыкі і ў сакралізацыю іх. Такім чынам, сацыяльныя нормы, забароны становяцца абавязковымі, непарушнымі.

У класавым грамадстве багі ўвасабляюць сацыяльную ўладу. Сацыяльная практыка ўсталёўваецца і асвячаецца праз міфічнае мінулае. У міфе расказваецца аб дзеяннях міфічных продкаў, культурных герояў, якія і вызначылі гэтыя абрад і забарону. Так з'яўляюцца абрады, рытуалы, шлюбныя нормы. Міфы і іх персанажы адгароджаны суровай таямнічасцю ад недасведчаных. Усталёўваецца непарыўная сувязь паміж міфам і рэлігійным абрадам. Міф тлумачыць і абгрунтоўвае рэлігійную цырымонію, гэтая цырымонія аднаўляе ў асобах пераказаны міф.

Міфалогія адыгрывае важную ролю ў гісторыі рэлігіі. Яна дае матэрыял рэлігійным вераванням, але не з'яўляецца самым істотным момантам рэлігіі. У многіх рэлігіях свету міфалогія складае другасны элемент. Вера ў міфы не абавязковая. Міфы — гэта набытак народнай фантазіі, якая тлумачыць факты навакольнага свету.

Маючы розныя карані, у міфалогіі і рэлігіі адзначаецца агульнае — фантазія. Якраз гэта ўжо на ранніх



Репозиторий БГУКИ

ступенях развіцця і садзейнічае ўключэнню міфалагічных уяўленняў у рэлігію.

У рэлігіі сустракаюцца культавыя міфы, звязаныя з рэлігійна-містычнымі абрадамі, у якіх абрад тлумачыцца ўласцівым міфалогіі спосабам: заснаванне гэтага абраду ўзводзіцца да глыбокай міфалагічнай старажытнасці, якая, у сваю чаргу, звязваецца з міфічнымі персанажамі. Сам міф, як і абрад, робіцца свяшчэнным.

Зліваючыся з рэлігійна-містычнымі абрадамі, міфы складаюць істотную частку зместу рэлігійных вераванняў. На позніх стадыях развіцця чалавецтва міфы нават робяцца рэлігійнымі дагматамі. Аднак у некаторых народаў развіццё фантазіі вяло да таго, што філасофскія і атэістычныя ідэі станавіліся асновай міфаў. Такім чынам, міфы на самых розных ступенях гістарычнага развіцця захоўвалі сваю незалежнасць ад рэлігіі.

Разыходжанне паміж гэтымі рознымі сферамі становіцца больш зразумелым тады, калі ўлічваць іх падабенства. Рэлігія і міфалогія займаюцца самасцвярджэннем асобы. У першай з іх асоба шукае ачышчэння, апраўдання і выратавання. У другой яна таксама імкнецца выявіць сябе, знайсці нейкую гісторыю. Гэтая агульная аснова высвятляе разыходжанне паміж рэлігіяй і міфалогіяй.

Рэлігія заўсёды была поўным самасцвярджэннем у вечнасці. Яна прагне выратавання асобы, такога яе ўмацавання, каб тая была не ў стане патрапіць у сферу збыткоўнага быцця. Важны агульны прынцып рэлігіі — жыццё і субстанцыяльна-цялеснае сцвярджэнне. Пры гэтым жыццё асобы мае на мэце сцвярджэнне субстанцыяльна-цялеснай упэўненасці ў быцці вечным і абсалютным.

Ці можна сказаць, што любая міфалогія рэлігійная? На гэтае пытанне трэба адказаць адмоўна. Міф сам па сабе не павінен быць прынцыпова рэлігійным. Рэлігія толькі прыўносіць у міф спецыфічны змест, які робіць міф рэлігійным.



Рэпазіторый БГУКІ

Але сама структура міфа зусім не залежыць ад таго, ці будзе напоўненай рэлігійным зместам. У міфе ў асобы адсутнічае прага выратавання, збавення. Магчымы нават міф, у якім няма ўказанняў на вечнасць, збавенне, адплату за грахі і інш.

У рэлігіі заўсёды прысутнічаюць ацэнкі часовага плана (з пункту гледжання вечнага жыцця). Тут прага прарвацца праз план граху, смерці да святасці, бессмяротнасці. Міф жа можа быць выказаны так, што ў ім не выявіцца ні аднаго рэлігійнага моманту.

Міф магчымы без рэлігіі. Але ці магчымая рэлігія без міфа? Строга кажучы, не. Рэлігія, праўда, можа да пэўнага часу не выяўляць свайго міфа. Яна, акрамя агульна-гістарычнага міфалагізму, па сваёй прыродзе вельмі набліжаецца да міфа, ужо сама па сабе змяшчае міфічнае. У ёй ёсць і міфічная творчасць, і жыццё.

Міфалогія шырэйшая за рэлігію: рэлігія — гэта спецыфічная міфалогія, менавіта міфалогія жыцця. Без міфа яна была б проста асобасным самасцвярджэннем, не мела б у сабе ніякага выяўлення дзейнасці асобы.

Такім чынам, міф не адметнае ўтварэнне рэлігіі (рэлігійная форма), а фенаменальнае самасцвярджэнне асобы, якое не залежыць ад праблемы ўзаемаадносін вечнасці і часу.

**Калацэй В.В.,**
аспірант кафедры
сацыялогіі і культуразнаўства

## ДА ПЫТАННЯ ПРОТАКУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ

Пачатак фарміравання беларускай народнасці звычайна звязваюць з XIV ст., калі пісьмовыя крыніцы фіксуюць першыя фанетычныя і марфалагічныя асаблівасці беларускай мовы. Працяглы шлях развіцця, які папярэднічаў гэтай часовай вясе, з'яўляецца прагісторыяй беларусаў (паводле В.В. Сядова).